

ДУК «Магілеўская раённая сетка публічных бібліятэк»
Брылёўская сельская бібліятэка

# Мая вёска Брылі

## (Гісторыка-краязнаўчае падарожжа)







# Агульныя звесткі

**БРЫЛІ** — вёска, цэнтр сельсавета (з 09.12.1975 г.) і калгаса. Зараз уваходзе ў склад Кадзінскага сельсавета. Вядома па рукапісных крыніцах з XVI стагоддзя. У 1560 г. сяло, 45 «дымоў», у Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 г. аддадзена ў пажыццёвае валоданне памешчыку. У 1592 г. цэнтр войтаўства Магілёускай воласці Аршанскага павета. У 1635 г. 48 двароў, меўся млын. У 1785 г. 49 двароў, 327 жыхароў, у складзе маёнтка Любуж Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка, які меў у 1866 г. у вв. Брылі і Любуж 2.765 дзесяцін зямлі, 2 млыны, пастаялы двор. Частка вяскоўцаў займалася сталярным промыслам. Па перапісу 1897 г. сяло (35 двароў, 201 жыхар, школа граматы, піцейны дом) і фальварак (1 двор, 11 жыхароў) у Палыкавіцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 г. 43 двары, 258 жыхароў, дзейнічала школа (народнае вучылішча).



У 1926 г. вёска (23 двары, 153 жыхары) і хутары (72 двары, 436 жыхароў). У 1929 г. арганізаваны калгас “Змагар”. На пачатку 1930-ых гадоў 4-гадовая школа пераўтворана ў 7-гадовую (273 вучні). У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У баях за вызваленне вёскі загінулі больш за 30 савецкіх воінаў, якія пахаваны ў брацкай магіле каля будынка школы. У памяць аб земляках, што загінулі ў гады вайны, у 1976 г. пастаўлена стэла.



# *<u>Успаміны Лісавай Еўфрасінні Свірыдаўны</u>*

Вёска Брылі заснавана даўно, калі мая бабуля была яшчэ маладая. Вёска была вялікая, пачыналася, дзе цяпер свінагадоўчая ферма, і цягнулася да сучаснаснага цэнтра (цяпер 1-ы пасёлак, вул. Першамайская). Хаты стаялі блізка адзна да адной, іх было каля 50. Кожнай хаце належыла зямля, яе было трохі -- каля 25 сотак. Гэтую зямлю сяляне купілі ў памешчыка Брыля.

Сяляне жылі па-рознаму: адны былі багатымі, іншыя беднымі. Найболей багатыя -- Лісаў С.А., Цеплякоў С.Ф., Кавалёў Ю.І., Буглакоў Л.М., Цеплякоў С.І. У іх зямля была не толькі ў вёсцы, але і ўдалечыні ад пасёлка. Найболей беднымі былі Кавалёў М.П., Новікаў М.І., Буглакоў І.М. А астатнія жыхары вёскі жылі сярэдне.

У вёсцы Брылі былі карчма, млын, на якім сяляне малолі збожжа.



# *Успаміны Мяшкова Данілы Іванавіча*

Калі жыхары в.Брылі разрасталіся, зямлі каля хаты стала мала. Бацькі куплялі сваім дзецям землі ўдалечыні ад вёскі Брылі. Так узніклі сялібы. З прыходам Савецкай улады многае змянілася ў жыцці людзей. Калектывізацыя вырашыла разбурыць сялібы і перанесці двары бліжэй да в.Брылі. Так з'явіліся другі і трэці пасёлкі в.Брылі (вул. Кастрычніцкая і вул. Палявая). Гэта было ў 1934-1940-х г.г. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны пасёлкі былі пабудаваныя. Пасёлкі былі вялікія: другі пасёлак -- 26 двароў, трэці пасёлак -- 20 двароў.





## *Успаміны Цепляковай Паліны Сяргееўны*

На тэрыторыі Брылеўскай зямлі было шмат людзей, якія весялілі жыхароў вёскі. Гэта мужчыны, якія маглі граць на музычных інструментах (гармоніку, балалайцы). У святы жыхары вёскі збіраліся, спявалі і танчылі. Шмат пявуннь было ў нашай вёсцы: жонка Лявона Баранава, клікалі яе Дар'я. Яна сваімі песнямі весяліла ўсіх. Добра спявалі Лісава Ефрасіння Свірыдаўна, Цеплякова Паліна Сяргееўна.



# Як апраналіся жыхары в.Брылі

*<u>Успаміны Карыткінай Веры Гардзееўны</u>*

Жыхары в. Брылі насілі ў даўніну саматканую адзежу. Пралі нітку з льна, воўны, шэрсці. Шылі ўсё неабходнае для сябе: кофты, спадніцы, хусткі. Мужчыны насілі кашулі доўгія, штаны. Усе насілі лапці, якія рабілі з лыка. Толькі найболей багатыя насілі боты, туфлі (па святах). Па святах найболей хораша апраналіся жанчыны. Шылі прыгожыя спадніцы, кофты, афарбоўвалі іх у прыгожыя колеры. Кофты гафтавалі markdown рознымі ўзорамі. Асабліва прыгожымі былі фартухі. Адзе-жу шылі з ваўнянай і ільняной матэрыі. Поўсць ткалі з аўчыны. Часамі было і так, што на ўсю вёску было 2-3 пары ботаў, тады да вяселля іх пазычалі адзін у аднаго.



Мужчыны ўзімку на галаве насілі шапкі з сукна і аўчыны, насілі футры з аўчыны. Жанчыны насілі хусткі, якія рабілі з ільняной і ваўнянай тканіны.

# Заняткі жыхароў в.Брылі

<u>*Успаміны Смаляковай Праскоўі Мінаўны*</u>

Жыхары вёскі Брылі здаўна (як казала мая бабуля) займаліся земляробствам: аралі зямлю, сеялі збожжа, саджалі бульбу, рабілі градкі. Жыхары вёскі таксама займаліся жывёлагадоўляй: разводзілі кароў, авечак, коней, трымалі курэй. Яшчэ ў вёсцы былі рамеснікі-кавалі, якія выраблялі ўсё неабходнае для таго, каб працаваць у полі (плугі, лапаты, вілы, граблі), а таксама неабходнае для хатняй гаспадаркі (вілы, чапелы, вёдры і г.д.).

Былі столяры і цясляры. Сярод іх было шмат добрых майстроў. Займаліся таксама і пчалярствам.





## *Успаміны Афітавай Ксеніі Цярэнцьеўны*

Жанчыны в. Брылі былі спрактыкаванымі майстрыцамі: яны пралі, ткалі. Усё гэта рабілі яны ўручную на кроснах. Пралі і ткалі з льна, поўсці (стрыглі авечак). Вечарамі жанчыны і дзяўчаты па некалькі чалавек збіраліся ў адной хаце і пралі ніткі на калаўротах, а некаторыя верацяном, а ткалі палатно ўжо кожная ў сябе дома. Пралі і спявалі, распавядалі розныя цікавыя гісторыі.



Вырабы былі прыгожыя. Ніткі фарбавалі. А калі з'явіўся шоўк, аздаблялі вырабы шоўкам, рабілі каляровыя аздабленні.

Старадаўняя песня:

*«Собирайтесь, девочки, у вдовушки, будем прясть ниточки шавковыя, ниточки шавковыя, девочки толковые».*

# Абрады Брылеўскай зямлі

## *Успаміны Лісавай Еўфрасінні Свірыдаўны і Халмовай Марыі Цітаўны*

Шмат абрадаў здзяйснялася на Брылеўскай зямлі. Адзін з іх вясельны.

Спачатку былі сваты. У сваты прыходзілі да нявесты маладой (жаніх), бацька жаніха і блізкія жаніха. Прыходзілі са сваім таварам, прасілі бацькоў нявесты прызнаць іх. Ставілі на стол гарэлку, закуску і клікалі да стала нявесту. Калі нявеста згодна, п'юць і гуляюць, а калі не, таксама п'юць, але назаўтра сваякі нявесты аддавалі грошы назад сваякам жаніха, якія былі патрачаны жаніхом,

Калі паспяхова прайшлі сваты, ускорасці і заручыны. На заручыны ідуць сваякі жаніха, жаніх, а з боку нявесты яе родзічы, сяброўкі і сама нявеста. Едуць на заручыны і спяваюць:

*«Пошли мы на заручены*
*Да сенцы закручены,*
*Пока двери открутили*
*Так и девочку заручили».*



А вось і вяселле. Раніцай жаніх са сватам, шаферам прыязджаюць за маладой і вязуць яе ў царкву да вянку:

*«У каморки девочка прибиралася,*
*А у неё сестрица пыталася:*
*Куда ты сестрица прибираешься*
*Ты в сад-виноград за красками».*

Нявеста адказвала:

*«Каб у сад-виноград за красками,*
*Так не было у меня веночка перлового*
*И не было перстенька золотенького*
*И не было бы хлопчика молоденького».*

Едуць да венку:

*«Поедем селом напролом.*
*Проломим стену каменем.*
*Не будем стену ломить,*
*А возьмём девочку за столом,*
*Выведет девочку мати»*







Пасля здзяйсняўся абрад шлюбу. Пасля вянка жаніх забіраў нявесту з царквы і вёз да сабе дадому. Нявеста дарыла падарункі родным жаніха, вешала сваю ікону на кут, слала стол белым абрусам. А пасля, калі госці садзіліся за стол, гэты абрус здымаўся і слаўся іншы, ставілі на стол пітво, закуску і пачыналася вяселле.

*«Снимайте скатерти пеньковые,*
*А молодая застелит шелковые».*



На вяселлі шмат пілі, елі і шмат спявалі.

Да свата: *«А у нашего свата голова лохмата, ноги крив*
*Нельзя ему встать, нам горелки дать».*

Да шафера: *«Поджаничничек, наш сокол,*
*Не садись миж оков,*
*Там пчелиный перелёт*
*Залетит тебе пчёлка в рот.*
*Укусит тебя за язык,*
*Из-за стола не побежишь»*

(жаніх і шафер кідалі гасцям цукеркі)
Госці жадаюць маладым доўгага і шчаслівага жыцця.

# Вёска ў гады Вялікай Айчыннай вайны

*Успаміны Баранавай Усціньні Пракопаўны*

Баранаў Васіль Кузьміч нарадзіўся ў 1922 годзе ў в.Качурына Магілёўскага раёна. У сям'і быў старэйшым сынам. Хлопец быў бачны, высокі, працавіты. У 1941 годзе, калі пачалася вайна, сам папрасіўся на фронт. Прабыўшы некалькі месяцаў на фронце, Васіль Кузьміч быў паранены -- куля ўвайшла на пяць сантыметраў у галаву. Затым яго кантузіла. Некалькі месяцаў ляжаў у шпіталі. І зноў вайна, фронт, бамбёжкі. У 1944 годзе Васіль Кузьміч ляжаў два месяца ў шпіталі непадалёк ад г.Іванава. З шпіталя вяртаўся дадому пешшу. На нагах былі апранутыя два правых чаравіка. Прыйшоў дадому вельмі худы -- як казала Ўсціння Пракопаўна, "Адны косткі, абцягнутыя скурай". Трохі аклемаўшыся, малады салдат зрабіў прапанову маладой дзяўчыне Ўсціньні. А Усціння Пракопаўна, не задумляючыся дала згоду, бо мужчын пасля вайны было вельмі мала. Пражылі яны доўга. Але вайна пастаянна давала аб сабе знаць -- Васіль Кузьміч быў вельмі нервовым, узбуджаным, па начах уздрыгваў, крычаў, уставаў. Усціньні Пракопаўне прыйшлося нялёгка -- пастаянна прыходзілася саступаць -- "ладзіць, апускаць галаву…"

Жылося пасля вайны не салодка. Але жылі, гадавалі дзяцей, завялі маленькую гаспадарку.

# *Успаміны Смаляковай Праскоўі Мінаўны*

Праскоўя Мінаўна Смалякова нарадзілася ў в.Брылі ў 1914 годзе. У сям'і было шмат дзяцей. Каб прахарчавацца, працавалі ў полі. А калі ў 1926 г. утварыўся калгас, Праскоўя Мінаўна навучылася кіраваць трактарам. Сем гадоў яна нароўні з мужчынамі арала і сеяла.

Пачалася вайна. Нашы войскі адыходзілі. І шматлікія салдаты папалі ў акружэнне. Вось аднойчы восеньскай уначы ў вёску прыйшлі пяць акружэнцаў разам з капітанам, якога клікалі Мікалай Пятровіч. Сярод іх быў Малькоў Іван Рыгоравіч, 1921 г. нараджэння, уражэнец в.Бніз Кічмінскага раёна Кіраўскай вобласці. Цэлых восем месяцаў Іван хаваўся ў склепе сям'і Смаляковых. Яны пакахалі з Праскоўяй Мінаўнай адзін аднаго і ў лістападзе 1941 гада пажаніліся.

Пазней капітан Мікалай Пятровіч звязаўся з партызанскім атрадам, які базіраваўся ў Быхаўскім раёне, і салдаты-акружэнцы сышлі туды. Яны ваявалі  з нямецкімі акупантамі на беларускай зямлі. У студзені 1943 гада ў Праскоўі Мінаўны нарадзіўся сын Цімафей. Але Іван Рыгоравіч аб гэтым нават не пазнаў.

Скончылася вайна, а ад Івана Малькова не было ніякіх вестак. Сын стаў ужо дарослы. І толькі ў 1968 годзе сям'і Смаляковых прыйшоў ліст ад былой партызанкі, якая ваявалі разам з Іванам у адным партызанскім атрадзе. Яна расказала, што Іван быў забіты пры вызваленні в.Кузьмікавічы Быхаўскага раёна ў няроўным бою з нямецкімі акупантамі. І быў пахаваны ў брацкай магіле разам з астатнімі загінулымі партызанамі ў в.Аляксандроўка Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Праскоўя Мінаўна разам з сынам Цімафеем ездзіла на гэтую брацкую магілу.

# *Успаміны Новікава Міхаіла Емяльянавіча*

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Новікаву М.Е. было 14 гадоў. Бацьку забралі на фронт. У сям'і было пяць дзяцей, старэйшым быў Міхась. У яго родную вёску Шапчіцы прыйшлі немцы. Цяжкія дні надышлі для жыхароў вёскі. Нялёгка было маці Міхася прахарчаваць дзяцей. Але самае страшнае для сям'і было яшчэ наперадзе. Вось што ўспамінае Міхась Емяльянавіч:

« 28 октября 1943 года д.Шапчицы окружили немецкие автоматчики. Заходя в каждый дом, они выгоняли всех живущих там на улицу. На улице отобрали молодых и здоровых и согнали в один дом. Я оказался среди согнанных. Плач и вой стояли на деревне. Матери сходили с ума от горя. Приставив к каждому немца, нас водили по домам взять одежду и кое-какую еду.  К вечеру нас погнали в д.Агеевка. Там в одном доме собрали всех согнанных из окрестных деревень молодых людей. Я оказался среди них. Наутро подогнали машины, погрузили нас и повезли в г.Могилёв. Там выгрузили в здании по ул.Ленинской. На следующее утро погнали рыть окопы на ул.Подгорную. Целую неделю рыли землю от темна до темна. Кормили один раз в день похлёбкой из капусты и свёклы.

Однажды утром подогнали крытые машины задом к тюрьме, погрузили людей и повезли на станцию. Перегрузили в вагоны-«телятники» и повезли на запад. Сначала до г.Барановичи, а затем через Польшу до Кенигсберга. За всю дорогу два раза поили водой. Затем был город Эрфурт и концлагерь. Истощённых за дорогу людей загнали в лагерные бараки. А через неделю меня привели на биржу, где отбирали на работу. меня отобрали для работы чернорабочим в фирму «Штин Фугрант». приходилось собирать мусор по городу и свозить на свалку. Очень хотелось есть. Иногда в куче мусора находили куски хлеба.

От постоянного недоедания и тяжёлой работы молодой организм не выдержал, и я заболел тифом. Немцы очень боялись этой  болезни, поэтому заболевших не лечили, а отправляли в крематорий концлагеря Бухенвальд, который находился в девяти километрах от Эрфурта. Страшный запах из этого  лагеря смерти доходил и до нас.

Меня определил в госпиталь отец хозяина фирмы. Это был старый уже немец. В госпитале меня пытались лечить. А когда я потерял сознание, меня выбросили вместе с умершими в морг. Забросали мёртвыми телами. Когда я очнулся, ужас охватил меня. Я стал кричать. Меня услышали. Вытащили и положили на кровать только что умершего русского. Таким образом, я остался жить.

В апреле 1945 года стал слышен грохот орудий. 17 апреля в город вошли американские войска. Освободили невольников. Русские были переданы советскому командованию. До 28 июня находился в фильтрационном лагере г.Мюльбера. Затем был отправлен на родину. Возвратился домой. Мать уже не надеялась видеть живым. Отец вернулся с фронта весь израненный и вскоре умер.

В 1949 году меня призвали в Красную Армию. С 1951 года живу в д.Брыли. 35 лет проработал в колхозе им.Ильича».

# Брылеўскі СДК

Брылеўскі СДК быў пабудаваны ў канцы 1970-х гадоў.

З 1981 г. дырэктарам клуба працуе Яцкоў Мікалай Адамавіч.

На тэрыторыі Брылеўскага СДК размяшчаецца Брылеўская сельская бібліятэка.





# Брылеўская сельская бібліятэка

Брылеўская сельская бібліятэка была адчынена прыкладна ў адзін час з ДУА “Дзіцячы сад “Брылі” (1968 г.). Першапачаткова бібліятэка размяшчалася ў будынку былога сельскага клуба.

У бібліятэцы працавалі: Яцкова Ала Міхайлаўна. Калі Ала Міхайлаўна пайшла ў дэкрэтны отпуск, то замест яе працавалі Новікава Кацярына Аркадзеўна, Рыбчак (Еліна) Святлана Іларыёнаўна. Зараз працуе Яцкова Юлія Мікалаеўна.

Бібліятэка абслугоўвае 6 населеных пунктаў: в.в.Брылі, Качурына, Камянка, Зылі, Малееўка, Канстанцінаўка.



У бібліятэцы колькасць чытачоў складае 365, наведванняў – 4050, кнігавыдачы – 7500.

Бібліятэка сумесна працуе з Брылеўскім СДК, Брылеўскім ФАПам і Кадзінскім сельскім Саветам.

Бібліятэка выпускае праект “Мінуўшчына. Гартаючы пажоўклыя старонкі…”, дзе публікуюцца матэрыялы па гісторыі Магілёўскага краю. На сённяшні дзень выйшла 43 выпускі.





# Дзіцячы сад

ДУА “Дзіцячы сад “Брылі” быў адчынены ў 1968 г.

У дзіцячым садзе выхоўвалася 12 дзяцей.

Загадчыцай працавала Пруднікава Тамара Фёдараўна.







# Брылеўскі ФАП

ФАП у в.Брылі быў заснаваны ў канцы 1950-х гг., калі быў заснаваны калгас імя Ільіча. За доўгі час ФАП размяшчаўся ў розных будынках. У 1982 г. быў пабудаваны новы будынак, дзе зараз і знаходзіцца ФАП.



Загадчыцай ФАПа працуе Кавалёва Алеся Уладзіміраўна. Санітаркай працуе Рамашкевіч Галіна Іванаўна.



# Брылеўская школа

*__Успаміны Арцюшэнка Надзеі Дзмітрыяўны__*

Зямля, на якой размешчаныя вёскі Падлессе і Брылі, належылі пану Канстанцінавічу. Ён жыў у вялікім драўляным доме, з мноствам хлявоў, была парная, шмат служак. Побач быў маёнтак іншага пана (імя яго не памятае ніхто). Ён быў вельмі багаты, і ў яго быў яшчэ адзін маёнтак у Любужы. Паны-суседзі сябравалі. У пана Канстанцінавіча быў сын, а ў гэтага пана была дачка (яна была гарбаценькая). Паны вырашылі парадніцца і пажаніць сваіх дзяцей. Пан аддаў сваю дачку за сына пана Канстанцінавіча, а ў прыдачу маёнтак у Брылях і цагляны двухпавярховы недабудаваны дом (які пасля стаў школай). Маёнтак Канстанцінавіча падвоіўся. А бацька-пан з'ехаў жыць у свой іншы маёнтак. Зямлі ў Канстанцінавіча было шмат: яму належыў лес, рэчка, млын, мноства дапаможных памяшканняў. Пасля Кастрычніка яны сталі калгаснымі, а падчас вайны іх разбурылі. Стары Канстанцінавіч памёр і ўвесь маёнтак застаўся маладому пану і нявесцы. Яны жылі ў хаце бацькі, а цагляны двухпавярховы дом дабудоўвалі. Дом дабудоўвалі павольна. Кажуць, што пан шмат выпіваў, гуляў на грошы ў карты, а на свой маёнтак увагі не звяртаў.



Напярэдадні рэвалюцыі (за 7-8 гадоў) пан стаў прадаваць свае землі і з'ехаў за мяжу. Сваю гарбаценькую жонку ён не ўзяў. Дзе яна, ніхто не ведае. Толькі з'ехаў ён са сваёй палюбоўніцай Насценькай (яна жыла ў вёсцы Качурына).

Яго землі купілі: Асмалоўскі, Парфененка, Багданаў, Манкевіч -- мой дзед (у нас захаваўся план зямельнага ўчастку). А астатнюю зямлю з недабудаваным цагляным домам купіў Смаляроў (Стары Смаляр). Імя яго не памятаем, ведаем, што пераехаў сюды з в. Нікалаеўка Шклоўскага раёна.

У старога Смаляра было чацвёра дзяцей: сыны Лаўрын і Алесь і дочкі Марыля і Зося. У Лаўрына было 9 дзяцей, а ў Алеся 5 дзяцей. Яны пабудавалі сабе хаты ў Подлессе, Новых Брылях (недалёка ад школы). А цагляны дом адбудоўвалі.

Алеся потым раскулачылі і расстралялі.

Пасля Кастрычніка цагляны дом быў ад Смаляроў узяты.
У 1927 годзе дом стаў школай.



## *Успаміны Гарнастаевай Пелагеі Максімаўны*

У 1929 г. я пайшла ў школу. 4 гады я хадзіла ў школу ў в. Качурына (там, дзе жыў Аўдзей Баранаў, поруч рэчкі была школа). А ў 1933 годзе адкрылася школа ў в.Брылі, і я там скончыла 7 класаў. Вучылася я ў школе добра, кожны год за выдатную вучобу атрымлівала граматы і кнігі ў падарунак.

У 1936 г. я скончыла 7 класаў, гэта быў першы выпуск у Брылеўскай школе.





## *Успаміны Багданава Яўгенія Міхайлавіча*

Падчас вайны школа не працавала. У школе стаяў карны атрад "Бандэра", дзе было некалькі немцаў і сорак добраахвотнікаў. Яны здзяйснялі набегі на партызан.

Падчас вайны ў 1943 годзе немцы на тэрыторыі гульнявой пляцоўкі рылі траншэі. І пры раскопках былі знойдзеныя пахаванні людзей. Магчыма, гэта быў могільнік, але гэта было даўно і ніхто аб гэтым не ведае.



Пасля вайны школу адкрылі ў 1944 годзе.



*Уваходзіць у спіс "Помнікаў архітэктуры Беларусі".*

# Па дарозе на Магілёў

У красавіку 1706 года Брылі наведаў гетман Украіны Іван Мазепа. Звесткі пра гэтае падае магілёўскі ігумен Арэст у сваім летапісы «Записки игумена Ореста»:

«Тогожъ времени (1706 года, Апрђля 10 дня) для встрђчи гетмана Ивана Мазепы, шедшаго съ Малороссійскимъ войскомъ, посыланы были изъ Могилева магистратскіе чиновники съ виномъ, медомъ, хлђбомъ и другими съђстными припасами. Гетманъ Мазепа принялъ благосклонно поднесеные ему дары, благодарилъ, въ городъ же Могилёвъ не пођхалъ, но стоялъ три дни недалеко отъ Могилева въ деревнђ Бриляхъ; а потомъ отправился къ Московскому Государю».



# Наш зямляк

Віктар Цімафеевіч Тураў — вядомы беларускі кінарэжысэр, народны артыст Беларусі і СССР – у час Вялікай Айчыннай вайны пражываў у в.Брылі. У 1944 годзе патрапіў з маці і сястрой пад аблаву і іх павезлі ў Нямеччыну, у сямейна-працоўны канцлагер, дзе знаходзіўся, пакуль не скончылася вайна.



# Таленты ад роднай зямлі

Мікалай Яцкоў нарадзіўся 22 мая 1959 г. ў Магілёве. З 1981 году працуе дырэктарам Брылеўскага сельскага Дома культуры Магілёўскага раёну.

Як паэт Мікола Яцкоў выпусціў кнігі “Кракаўскі сшытак”, “Міколавы прыпеўкі”, “Хрышчацік” і інш.

Мікалай Яцкоў актыўна выступае як кампазітар-песеннік. З’яўляецца аўтарам песенных зборнікаў “Гронка бэзу” (Т.Ляшонак), “Родныя вобразы” (Якуб Колас), “Вяртанне” (Раіса Баравікова) і інш.



У 1984 г. М.Яцкоў ажаніўся. Яго жонкай стала Ала Міхайлаўна Савіцкая. Яна заўсёды падтрымлівае Мікалая, з’яўляецца яго “музай”.



Мікалай Яцкоў выпусціў кампакт-дыскі: “Пуцяводная ніць” (Станіслаў Валодзька), “Успомніце хоць раз” (Рыгор Барадулін), “Мае сны без цябе пустыя” і “Непрычалены човен” (Эдуард Акулін), “Знічка” (Іван Карэнда), “Врата” (Валянцін Барадзін), “Не боюсь я тебя потерять” (Мікалай Траянаў), “Осень” (Аляксандр Казека).

Песні Мікала Яцкова ўвайшлі ў рэпертуар такіх артыстаў Беларусі, як Мікалай Скорыкаў, Нэлі Багуслаўская, Надзея Мікуліч, Леанід Нікольскі, Уладзімір Ухцінскі, Алег Бляхарчук.

Мікалай Яцкоў – аўтар музыкі афіцыйна зацверджанага “Гімна Магілёва” (у сааўтарстве з Аляксандрам Шлеянковым).

З 2006 па 2011 год у в.Брылі выходзіў інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь “Брылёўскі летапіс”.

Мікалай Яцкоў з’яўляецца старшынёй грамадскага аб’яднання Магілёўскага абласнога аддзялення “Саюза беларускіх пісьменнікаў”.

Саюз беларускіх пісьменнікаў

# Дзякуй за ўвагу!





# Прэзентацыю падрыхтавала:

**Юлія Мікалаеўна Яцкова – бібліятэкар**
**Брылёўскай сельскай бібліятэкі**

**2014 г.**